Приложение 6

Навуковая праца “Здабытае страчанае: царква Святой Ганны”

(аўтар Баран Раман, вучань 10 класа, кіраўнік Урбановіч З.А.)

УВОДЗІНЫ

Свіслаччына – самабытны куточак Гродзеншчыны. Большая частка яе размешчана ў незвычайным месцы: на тэрыторыі нацыянальнага парка “Белавежская пушча”, што з’яўляецца своеасаблівым сімвалам, візітнай карткай нашай краіны, гордасцю беларускага народа. У цяперашні час, калі бурнымі тэмпамі развіваецца этнатурызм, экатурызм, наша малая радзіма здзіўляе наведвальнікаў не толькі прыгажосцю краявідаў, працавітасцю, гасціннасцю і шчырасцю яе жыхароў, чысцінёй, утульнасцю вёсачак, але нават трапнасцю, дакладнасцю, мілагучнасцю мясцовых назваў і архітэктурных збудаванняў, якія ўвасобілі ў сабе ўсю прыгажосць і непаўторнасць гэтага пушчанскага краю.

Уся зямля беларуская ўсыпана прыгожымі зоркамі-дыяментамі, старажытнымі помнікамі архітэктуры - гэта і Мірскі замак, і Нясвіжскі замак, Навагрудская княжацкая рэзідэнцыя ў выглядзе крэпасці-ўмацавання, светлая Каложа над Нёманам і Траецкае прадмесце ў Мінску, таксама Жыровіцкі манастыр, Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку і многія іншыя. Помнікі гэтыя - мураваны летапіс, які лепш за любую машыну часу перанясе цябе ў мінулае, у далёкія часы нашых продкаў.

Архітэктура Беларусі - гэта летапіс народа ў дрэве і камені. Старажытныя замкі, ратушы, храмы з’яўляюцца адбіткам таленту народа. Архітэктурная спадчына Беларусі - невычарпальны калодзеж творчай фантазіі многіх пакаленняў, якія на працягу стагоддзяў стваралі непаўторны вобраз краіны.

Ці ведаеце вы, што некалі на тэрыторыі Беларусі існавала каля тысячы храмаў: замкаў, палацаў, касцёлаў, цэркваў, кляштараў? Калі згадзіцца з

выказваннем, што архітэктура – гэта застылая музыка, дык наша краіна можа па праву лічыцца адной з самых музычных.

У даўніну, пяць або шэсць стагоддзяў назад, падарожнікі, якім выпадала ехаць праз Беларусь, амаль праз кожныя 10—15 кіламетраў бачылі магутныя сцены храмаў. Яны стаялі на варце дзяржаўнай бяспекі.

ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Дабравольскі дзіцячы сад-сярэдняя школа” працуе над рэалізацыяй рэспубліканскага інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі маральнага развіцця навучэнцаў у сучаснай адукацыйнай прасторы на праваслаўных традыцыях і каштоўнасцях беларускага народа з улікам рэгіянальнага сацыякультурнага кластара”. І адным з напрамкаў работы па праекце з’яўляецца арганізацыя краязнаўчай дзейнасці па тэме “Духоўная спадчына свіслацкага краю”. У сувязі з гэтым адбылося навуковае даследаванне, у час якога было вызначана, што рэлігійнае жыццё Свіслаччыны, адпавядаючы павевам сённяшняга часу, працэсу духоўнага адраджэння, дынамічна развіваецца. За апошняе дзесяцігоддзе XX стагоддзя ў раёне былі адрамантаваны і адкрыты будынкі цэркваў: Царква Святой Ганны ў вёсцы Задваране (1994 год), Свята-Петра-Паўлаўская царква ў вёсцы Гарнастаевічы (1992 год), Свята-Успенская царква ў аграгарадку Дабраволя (1989 год), храм Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў в.Яцвеск (1993 год). Акрамя адрэстаўрыраваных будынкаў былі ўзведзены і новыя храмы: у 1993 годзе - царква Святога Архангела Міхаіла ў в.Новы Двор, у 1994 годзе - касцёл Святога Францыска Асізскага ў г.Свіслач, у 2019 годзе – храм Раства Прасвятой Багародзіцы ў г.Свіслач.

Мяне вельмі зацікавіла гісторыя храма Святой Ганны, які знаходзіцца ў вёсцы Задваране. Чаму? Пра гэты храм я многа чуў яшчэ ў дзяцінстве ад сваёй бабулі Касьян Марыі Юльянаўна, якая ўвесь час яго наведвала, там была ахрышчана, абвенчаны дзядуля з бабуляй і мае бацькі. На дадзены момант па стане свайго здароўя, на вялікі жаль, бабуля не можа там бываць. Я настолькі захапіўся яе аповедамі, што вырашыў даследаваць гісторыю ўзнікнення храма, перыяд яго заняпаду, а таксама працяглы працэс адраджэння.

Мэта: даследаванне гісторыі помніка храмавай архітэктурнай спадчыны Свіслаччыны канца XVIII ст. – царквы Святой Ганны ў вёсцы Задваране.

Для ажыццяўлення дадзенай мэты былі пастаўлены наступныя задачы:

- вывучыць літаратуру па тэме;

- сабраць і сістэматызаваць звесткі пра гісторыю царквы Святой Ганны: яе ўзнікненне, заняпад і адраджэнне;

- вызначыць асноўныя рысы, асаблівасці і значэнне храма для свіслацкай зямлі.

Аб'ект даследавання – царква Святой Ганны. Прадмет даследавання – гісторыя ўзнікнення, заняпад і адраджэнне даследаванага храма.

У чым актуальнасць працы? Па-першае, даследаванне помнікаў храмавай архітэктуры дазваляе пашырыць веды пра гісторыю малой радзімы, па-другое, павышае назіральнасць і вучыць знаходзіць цікавае і недаследаванае побач.

Глава 1. Канфесійнае становішча на Свіслаччыне ў XVII - І палове XX стст.

1.1. Рэлігійнае жыццё на свіслацкай зямлі

Важны ўклад у развіццё рэлігійнага жыцця на Свіслаччыне ў XVII стагоддзі ўнёс яе ўладальнік падскарбій ВКЛ Іеранім Крышпін-Кіршэнштэйн. У1668 годзе ён выдзяліў сродкі на пабудову тут касцёла Святой Троіцы і пры ім адначасова заснаваў парафіяльную школу. Тады касцёл пабудавалі з дрэва, і таму ўжо ў 1742 годзе ён быў рэстаўрыраваны на сродкі Тарэзы Крышпінавай, кашталянкі троцкай [12].

Прыкладна ў той жа час, калі быў заснаваны ў Свіслачы касцёл, тут была пабудавана і новая царква, адкрыццё якой адбылося 8 верасня 1788 года, у дзень Прасвятой Багародзіцы, чыё імя яна і насіла.

На 1890 год вядома, што ў свіслацкім праваслаўным дэканаце існавала 9 парафій, на якія прыходзілася 11 храмаў, 10886 веруючых, з іх ліку — 1844 веруючых са свіслацкай парафіі. Каталіцкая свіслацкая парафія адыходзіла да ваўкавыскага дэканата, мела 4 касцёлы — у Свіслачы, Поразава, Рудні,

Грынках. На свіслацкую парафію прыходзілася 2050 веруючых. Трэцяя па колькасці рэлігійная абшчына — іўдзейская, па воласці налічвала 8 сінагог і малітоўных дамоў, а ў самой Свіслачы кагал уключаў 997 яўрэяў [1].

Часта адбываліся непаразуменні паміж прадстаўнікамі канфесій. Найбольшы скандал у мінулым стагоддзі адбыўся ў яўрэйскім жыцці ў сувязі з дзейнасцю ў Свіслацкім прыходзе праваслаўнага святара Аляксандра Гамаліцкага, які вымусіў частымі скаргамі на імя губернскай улады разбірацца чыноўнікам у "неблагонадежности евреев и оскорблении святой церкви в том, что они умышленно разоряют скотом земли церкви" [8].

З падобнымі рэлігійнымі сваркамі на Свіслаччыне Гродзенская ўправа сутыкалася даволі часта. Так, у 1905 годзе, рапарт земскага начальніка 4 земскага ўчастка Ваўкавыскага павета сведчыць: "Считаю лишь одно Порозово не благополучно. Крестьяне исключительно не благонадежны, еврейское население особенно. Антогонизм католиков и православных развит и заметно обострен, как и между священником и ксендзом. Во всей жизни местечка не исключена даже религиозная рознь... Имеются угрозы жизни священнику и православной церкви взрывом" [14].

Прыведзеныя прыклады рэлігійнай барацьбы ў Свіслачы - яркае адлюстраванне таго неспакойнага і цяжкага для канфесійнага боку жыцця народа ў разглядаемы адрэзак часу.

1.2. Храмавае архітэктурнае багацце свіслацкага краю

Храмавая архітэктура (або сакральная архітэктура) — архітэктура, якая займаецца праектаваннем і збудаваннем месцаў глыбокай пашаны і святых культавых аб'ектаў, такіх, як цэрквы, мячэці, касцёлы, сінагогі [2].

На свіслацкай зямлі прыцягваюць увагу турыстаў касцёл Святога Міхаіла Арханёла (1825—28 гг.), які тройчы адбудоўваўся па прычыне пажару (1460 год, 1767 гг.), і царква Святой Троіцы (1872 г.) у Поразава, Свята-Петра-Паўлаўская царква ў в.Гарнастаевічы (1801 г.), царква Святой Ганны (1790 г.) у в.Задваране, царква Уздзвіжання Крыжа Гасподняга ў г.Свіслач (1788 г.), царква Успення Прасвятой Багародзіцы ў в.Дабраволя (1861 г.), царква

Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў в.Яцвеск (1879 г.), царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў пас.Астроўскі (канец 19 ст.). Яны адлюстроўваюць асаблівасці гістарычнага развіцця нашага раёна і ўтрымліваюць звесткі аб верацярпімасці беларускага народа і разнастайнасці рэлігійных канфесій.

У XX ст. асобныя пытанні аб храмавай архітэктуры Свіслаччыны ў сваіх навуковых працах закраналі такія вучоныя, як І.В.Соркіна [15,16], С.Л.Раманаў [14], А.Мялешка [7], В.М.Князева [3]. Прысвячалі гэтай тэме свае артыкулы краязнаўцы Свіслаччыны А.С.Палубінскі [13] і М.Пакутнік [10], польскі пісьменнік і мемуарыст Леан Патоцкі [12]. У свой час шмат аб'ектаў храмавай архітэктуры Свіслаччыны знайшлі адлюстраванне на малюнках Напалеона Орды, выпускніка Свіслацкай гімназіі, і польскага мастака Вітольда Карпызы, навучэнца Свіслацкай польскай настаўніцкай семінарыі. У 2004 годзе была выдадзена кніга "Памяць. Свіслацкі раён: Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі" [11], у якой змешчаны матэрыял пра дзеючыя помнікі храмавай архітэктуры Свіслацкага раёна.

Глава 2. З гісторыі царквы Святой Ганны

2.1 Узнікненне храма ў в.Харашэвічы

Царква пабудавана памешчыкам Харашэвічаў Якімам Мікалаевічам Булгарыным на яго ўласныя сродкі ў 70-х гадах XVIII стагоддзя [9]. У той жа час у энцыклапедыі "Праваслаўныя храмы Беларусі" ўказваецца, што царква пабудавана ў І-ай палове XIX ст. з цэглы [4, с.405].

У 1877 годзе інжынер Леанард Кржыжаноўскі выканаў абмерныя чарцяжы царквы [5, с. 47-48], (Дадатак 5). У 1880 годзе архітэктар Пётр Залатароў прадставіў праект перабудовы царквы і спраектаваў іканастас для яе [6, с. 80].

Як запісаў у 1880 годзе настаяцель храма Пётр Праабражэнскі, "будынак царквы каменны з чарапічным дахам. Унутраная плошча храма роўна 54 кв. сажням, без скляпенняў. Столь драўляная і атынкаваная; печаў няма. Пасад адзін, да 1856 года ў гонар Святой Троіцы, а з 1856-га - у гонар Пакрова

Прасвятой Багародзіцы. Іканастас драўляны прамы, плотніцкай працы, без разьбы і ў адзін ярус. Царскія дзверы драўляныя, у верхняй палове кратаваныя і без асаблівых малюнкаў" [4, с. 174].

Магчыма, што адразу ў XVIII ст. царкву ўзвялі з дрэва, а ў XIX ст. - з цэглы. Будынак царквы каменны, з чарапічным дахам. З усходняга і заходняга бакоў ёсць каменныя пабудовы: з усходняга - рызніца, з якой адны дзверы вядуць да алтара, а другія - да агароджы. З заходняга боку прыбудова не злучаецца з алтаром праходам - уваход у яе ад агароджы.

Помнік архітэктуры позняга класіцызму. Вырашаны прамавугольным у плане аб'ёмам, які ўступам пераходзіць у паўкруглую апсіду з бакавой нізкай рызніцай. Да фасада дабудавана трох'ярусная чатырохгранная званіца, завершаная макаўкай; 2-і ярус вырашаны 4-калонным прысценным порцікам з трохвугольным франтонам. Званіца пабудаваная на ўласныя сродкі святаром Кірылам Шырынскім. Званоў тры: адзін важыць 4 пуды 35 фунтаў, другі - два пуды, а трэці - адзін пуд.

Макаўкай завершаны двухсхільны дах над алтарнай часткай. Фасады расчлянёны арачнымі аконнымі праёмамі (Дадатак 2).

Знешні выгляд храма ўяўляе форму прадаўгаватага крыжа; вокны ў адзін ярус без жалезных рашотак і з прычыны ўзнёслага становішча мала даюць святла. Акно ў рызніцы мае краты. Купалоў на царкве няма, крыжы жалезныя. Звонку царква пабеленая. Пад алтарнай часткай храма ёсць склеп.

Драўляны дом для святара, які знаходзіўся недалёка ад царквы, быў пабудаваны ў 1877 годзе былым святаром Вяхіравым на яго ўласныя сродкі з падоранага памешчыкам Шыраевым лясного матэрыялу. З 1845 года па 1878-ы на службе пры царкве былі святары Мікалай Шырынскі, Кірыл Шырынскі, Ян Паўлавіч, Іосіф Івацэвіч, Мікалай Вяхіраў. Да 1876 года ў склад парафіі ўваходзіла 6 вёсак: Падчарнейкі, Задваране, Дарані, Зарачане, Савані, Дашкавічы. У 1876 годзе былі прыпісаныя яшчэ вёскі Лаўрынавічы, Церахавічы, Алісеевічы, Мінічы і Кулявічы. У прыходзе было народнае

вучылішча, заснаванае ўрадам у 1860 годзе. Грашовае ўтрыманне вартаўніка, ацяпленне і рамонт вучылішча праводзілася прыхаджанамі (Дадатак 3).

Існуе і легенда, звязаная з гісторыяй узнікнення храма. Яе расказала Яўгенія Сцяпанаўна Кавалеўская, жыхарка вёскі Задваране, 1942 года нараджэння. Калісьці ў гэтых месцах жыла памешчыца Ганна. Нягледзячы на малады ўзрост, яна была хваравітай дзяўчынай. Частку свайго маёнтка Ганна аддала пад будаўніцтва царквы, і пры закладцы падмурка, нібыта па яе распараджэнні, пад адзін з кутоў схавалі 5 кілаграмаў золата. Менавіта гэтая інфармацыя, дакладнасць якой ніхто не пацвердзіў, прыводзіла сюды шукальнікаў скарбаў. Аднак усе яны з'язджалі ні з чым.

2.2 Разбуральны пажар 1972 года

За час існавання храм зведаў тры пажары, апошні з якіх, самы разбуральны, быў у 1972 годзе. Тыя ж, хто здзейснілі падпал храма, не ведалі, што іх учынак, акрамя шкоды і глыбокага смутку, адкрые людзям некаторыя таямніцы гісторыі храма. Пасля пажару ўнутры згарэлага памяшкання кругом быў развал. На гэта месца часам наведваліся людзі, якія цікавіліся руінамі былой царквы. Цагляны мур паступова абсыпаўся, і, нарэшце, абваліўся. Падвальным уваходам у рызнічнай частцы храма мясцовыя людзі вельмі зацікавіліся і сталі яго даследаваць. У выніку быў знойдзены абвалены з-за старажытнага паходжання падземны тунэль, які вёў прыкладна да вёскі Лыскава, якая знаходзіцца ад храма на адлегласці каля 10 км. Так як было небяспечна здзяйсняць прыватныя даследаванні, то паступова цікавасць да гэтай з'явы згасла.

У той час, калі ў СССР квітнеў атэізм, падпал храма і яго ліквідацыя лічыліся цалкам маральным учынкам. Такім грубым спосабам паступілі і з храмам Святой Ганны. Спецыяльна быў спланаваны падпал. Часам быў вызначаны дзень святкавання памяці Святога Мікалая - 22 мая. Людзі сталі збягацца да месца пажару, выклікалі пажарных і сваімі сіламі спрабавалі садзейнічаць таму, каб зберагчы ад пажару розныя царкоўныя прадметы. Многія абразы былі выратаваны з агню. Пасля, ужо праз дзясятак гадоў, яны

сталі паступова вяртацца, іх прыносілі ў храм і размяшчалі на сваіх месцах. У сувязі з падпалам, святара на парафіі не стала, і вернікам парафіі даводзілася звяртацца да святароў суседніх парафій Поразава, Новага Двара, Ізабеліна, Лыскава для здзяйснення сакрамэнтаў і духоўнага акармлення.

У самым цэнтры прыходу стаяла і паступова руйнавалася забытая царква. Пасярэдзіне яе выраслі хмызнякі, розныя дзікія травы, дрэвы сталі цвёрда грунтавацца ў гэтым ціхім кутку (Дадатак 4).

Аднойчы ў чэрвені 1975 года, падчас летніх канікул, на развалiны прыйшло пагуляць некалькі прыезджых да сваіх бабуль і дзядуль хлопчыкаў. Яны сталі шукаць што-небудзь цікавае, каб пазабаўляцца. Такі прадмет знайшоўся. Гэта быў адзін з выкарыстаных пажарных тэхнічных інструментаў. Хлопчык пачаў біць па прадмеце настолькі моцна, што раптам, у адно імгненне ўсе пачулі і ўбачылі перад сабой абвал сцяны ў алтарнай частцы храма на паўтары цэглы. Калі зазірнулі ў праём, то ўбачылі невялікага памеру драўляную труну. Труна была настолькі добра захавана, што некаторыя казалі: «Яе зусім нядаўна туды паставілі». Дзеці, усвядоміўшы ўбачанае, спалохаліся і пабеглі паведаміць сваім родным. На гэта месца прыходзіла нямала людзей, многія хацелі паглядзець на магілу нябожчыцы Ганны. У труне знаходзіліся рэшткі дзяўчыны. Была змешчана таблічка з надпісам: “Ганна, нарадзілася ў 1700 годзе, памерла ў 1725 годзе 5 мая”.

Людзі, якія прыходзілі на магілу, спадзяваліся там знайсці каштоўнасці, але акрамя чалавечых касцей, доўгай заплеценай жаночай касы і вялікага старадаўняга грэбеня для валасоў, нічога так і не знайшлі. Магіла каля трох гадоў была адкрытай. Але знайшліся людзі, якія акуратна склалі ў адным месцы развернутыя рэшткі памерлай і замуравалі грабніцу пад падлогай алтарнай часткі храма.

2.3 Адраджэнне царквы Святой Ганны

Працэс адраджэння царквы Святой Ганны цягнуўся з 1985 па 1994 гг. Ён быў доўгім і пакутлівым: збор подпісаў, сродкаў, пошукі будаўнікоў.

Пасля пажару ў 1972 годзе храм вырашылі аднаўляць у 1985 годзе. Каб атрымаць дазвол Свіслацкага райвыканкама на будаўніцтва, трэба было сабраць подпісы жыхароў усіх навакольных вёсак. Заняліся гэтым дэпутат Ханявіцкага сельскага Савета Аляксандр Пятровіч Навумік і Надзея Яфімаўна Немец (на жаль, іх ужо няма ў жывых). Калі неабходныя паперы былі падпісаныя, пачаўся працэс пошуку будаўнічых матэрыялаў і майстроў, якія б заняліся рамонтам. Знайшліся будаўнікі сярод мясцовых жыхароў. Гэта Фёдар Адамавіч Кур'ян, Леанід Іванавіч Белавус, Фёдар Міхайлавіч Калагрыў. Яны ўсё зрабілі сваімі рукамі, нават іканастас, здавалася б, такі няпросты ў выкананні. Працавалі на будаўніцтве прыхаджане і ўсе, хто лічыў сваім святым абавязкам адрадзіць дом Божы. Вельмі дапамагло будаўнічымі матэрыяламі кіраўніцтва былога калгаса імя Чкалава, на тэрыторыі якога размешчаны храм.

У 1994 годзе ўсе будаўнічыя работы былі завершаны (Дадатак 1). Першым настаяцелем царквы Святой Ганны стаў святар Уладзімір Сцяцко. У цяперашні час жыццё прыходу ў гонар Праведнай Ганны наладжваецца, нягледзячы на ўсе цяжкасці і перашкоды, з якімі сутыкаецца асноўны кантынгент вернікаў. Гэта пажылыя людзі (ад 60 да 80 гадоў), якія лічацца ў храме, як ні дзіўна, самымі маладымі і нават моцнымі на здароўе. Нягледзячы на зімовы мароз, летнюю спякоту, багаты снегапад або праліўны дождж, яны дакладна імкнуцца паслужыць царкве сваёй малітвай і асабістым паслушэнствам: спевам, чытаннем падчас набажэнстваў, выпечкай прасфор для службы, уборкай у храме і многімі іншымі дзеяннямі. Звычайна на набажэнства ў храме збіраюцца ад пяці да пятнаццаці чалавек. Але на вялікія святы ў царкву прыходзяць нават нямоглыя састарэлыя людзі. Асабліва на прастольнае свята 7 жніўня, калі ўвесь прыход шануе памяць святой Праведнай Ганны, маці Прасвятой Багародзіцы. Тады ж здзяйсняецца асаблівая служба ў прысутнасці ўсіх святароў Свіслацкага благачыння.

У храме ёсць рэдкі абраз “Успення Праведнай Ганна”, дзе святая Ганна намалявана з дачкой Марыяй на руках. Да яе звяртаюцца за дапамогай бясплодныя маладыя пары.

Першым настаяцелем пасля аднаўлення і асвячэння быў святар Уладзімір Сцяцко. Змяніў а.Уладзіміра святар Павел Жукоўскі. На працягу трох гадоў настаяцелем храма з'яўляўся святар Сергій Савёнак. А з 03.12.2010 года - іерэй Уладзімір Шведаў.

На працягу многіх гадоў прыхаджане царквы Святой Ганны імкнуліся паляпшаць унутранае ўбранне храма і яго знешні і ўнутраны выгляд. Яны актыўна ўдзельнічалі ў рамонтна-аднаўленчых працах. З Божай дапамогай храм набываў усё лепшы выгляд. Рамонтныя работы ў храме ажыццяўляліся пры свяшчэннікаx: Уладзіміры Сцяцко, Паўле Жукоўскім, Сергіі Савёнку. Каб знешні выгляд царквы заўсёды цешыў людзей, перыядычна рамантаваліся бакавыя часткі храма, алтар і высокая, з усіх бакоў прыходу бачная, званіца.

У 2008 годзе на базе храма быў створаны аматарскі хор. На адборачным туры VIII абласнога фестывалю праваслаўных песнапенняў «Каложскі дабравест» выступленне хору было адзначана ганаровай граматай.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

У працэсе праведзенага даследавання былі зроблены наступныя вывады.

1.Гісторыя ўзнікнення храма непарыўна звязана з палітычнымі і канфесійнымі працэсамі, якія праходзілі на даследаванай тэрыторыі.

2.Змены ў палітычным становішчы краю прыводзілі адпаведна і да зменаў у канфесійным жыцці.

3.Адраджэнне храма мела вялікае значэнне для жыцця дадзенага рэгіёна, паколькі царква Святой Ганны з’яўлялася асяродкам развіцця культуры, духоўнага жыцця народа.

Практычная значнасць працы складаецца ў тым, што дадзены матэрыял можна выкарыстоўваць на ўроках гісторыі Беларусі, пры правядзенні пазакласных і выхаваўчых мерапрыемстваў, экскурсій. Матэрыялы нашага

даследавання знаходзяцца ў элекронным рэсурсе “Чым хата багата”, размешчаным на сайце ўстановы адукацыі.

Такім чынам, можна канстатаваць, што за часы свайго існавання беларускі народ стварыў выдатную гістарычную спадчыну. Царква Святой Ганны ўваходзіць у склад архітэктурнага багацця свіслацкай зямлі, якой належыць асаблівае месца ў агульнакультурным кантэксце. Абумоўлена гэта тым, што архітэктура знаходзіцца на памежжы матэрыяльнай і духоўнай культуры, адначасова ўвасабляе ў сабе мастацкія элементы з непасрэдным грамадскім прызначэннем.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Бобровский П. О. Материалы для географии и статистики. Гродненская губерния. - Т. 1 - Спб, 1863. - С. 615. Рэжым доступу: https://www.twirpx.com/file/916324/ - Дата доступу: 06.11.2019.

2. Вікіпедыя – свабодная энцыклапедыя / [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/ – Дата доступу: 03.10.2019.

3. Князева, В.М. Падарожжа па Беларусі: Гарады і гарадскія пасёлкі / В.М. Князева. - Мінск: Беларусь, 2005. - 303 с.

4. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / А.М. Кулагін. – Мн.: БелЭн, 2007. – 653 с. – С.405

5.Кулагин А. Н. Архивные сведения о гродненских зодчих XIX — начала XX веков // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклярыстыкі. Выпуск 23. — Мінск, «Права і эканоміка». — 2017. — С. 47—48

6.Кулагин А. Н. Гродненские зодчие XIX — начала XX веков (новые архивные изыскания). // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклярыстыкі. Выпуск 22. — Мінск, «Права і эканоміка». — 2017. — С. 80

7. Мялешка, А. З гісторыі канфесійнага становішча на Свіслаччыне / А. Мялешка // Старонкі гісторыі Свіслацкага краю: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі / пад рэд. І.П. Крэня. - Гродна: ГрДУ, 2001. - С. 169 - 174.

8. Нацыянальны гістарычны архіў у Гродна, ф. 1, воп. 6, спр. 41, арк. 1186-1187.

9.Нацыянальны гістарычны архіў у Гродна, ф. 97, воп. 2, д. 26, с. 15

10. Пакутнік, М. Імёны і гістарычныя помнікі Свіслацкай зямлі /М.Пакутнік. – Свіслач, 2012. – 80 с.

11. Памяць. Свіслацкі раён: Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал. І.І.Варанец і інш.; Маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: Беларусь, 2004 г. - 526 с.

12. Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. - Мн.: Полымя, 1997. - С. 28. Рэжым доступу: https://knihi.com/Lean_Patocki/Uspaminy_pra_Tyskievicavu_Svislac,_Dziarecyn_i_Ruzanu - Дата доступу: 05.09.2019.

13. Полубинский А. Свислочь накануне пожара // Заветы Ильича. -1989. - 30 ноября. - С.3 Заветы Ільича, №50, 30 ноября 1989 года

14. Раманаў, С. Касцёл Святой Тройцы // Свіслацкая газета. - 2009. – 6 верасня. – С.3

15. Соркіна, І. Мястэчка Свіслач у першай палове XIX ст. /І.В. Соркіна // Старонкі гісторыі Свіслацкага краю: Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі 23 мая 1998 г. г. Свіслач/пад рэд. І.П. Крэнь. - Гродна: ГрДУ, 2001.- С.48-61 Рэжым доступу: file:///C:/Users/Admin/Downloads/94975pdf%20(3).pdf – Дата доступу: 08.10.2022.

16. Соркіна, І. Мястэчкі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. – Вільня: ЕГУ, 2010. – 488 с. Рэжым доступу: https://files.knihi.com/Knihi/uploaded08/Ina_Sorkina.Miastecki_Bielarusi_u_kancy_XVIII_piersaj_palovie_XIX_st._Miestiecki_Bielarusi_v_koncie_XVIII_piervoj_polovinie_XIX_v.pdf - Дата доступу: 12.10.2022.

Дадатак 1

Царква Святой Ганны



Дадатак 2

Царква Святой Ганны





Дадатак 3

З “Гродзенскага праваслаўнага царкоўнага календара 1899 года”

48) Въ с. **Хорошевичахъ**. Волковыскаго уѣзда, Подороскаго благочинія, въ приходской церкви. Церковь каменная, съ таковою же колокольней, въ каменной оградѣ,—сооружена мѣстнымъ помѣщикомъ Іоакимомъ Булгариномъ—неизвѣстно когда,—въ 1894 году „въ память спасенія Царственнаго Семейства отъ смертной опасности 17 октября 1888 года“ отремонтирована заново средствами прихожанъ и другихъ жертвователей. Въ ней имѣется мѣстно особенно чтимая св. икона Успенія Праведныя Анны. Отстоитъ отъ г. Волковыска въ 30 верстахъ.—Прихожанъ при ней: 1163 мужескаго пола и 1154 женскаго, а всѣхъ 2317,—

въ 12 селеніяхъ: Хорошевичахъ, Дашкевичахъ, Дерсней, Задворянахъ, Зарѣчанахъ, Кулевичахъ, Лавриновичахъ, Минчахъ, Ольсевичахъ, Подчернѣйкахъ, Саваняхъ и Череховичахъ,—изъ коихъ самое отдаленное отъ приходской церкви—Череховичи—въ 5 верстахъ. Имѣются: братство съиздавнее,—церковно-приходское попечительство,—церковная школа—въ Череховичахъ, съ 22 учащихся мальчиковъ,—и народное училище—въ Хорошевичахъ.—Причтъ состоитъ изъ 2 лицъ: священника и псаломщика, съ жалованьемъ 486 рублей 8 копѣекъ и 17 рублей 43 копѣйки аннуатныхъ съ мѣстнаго имѣнія при натуральной выдачѣ отъ него же. Земли церковной въ пользованіи причта: усадебной 14 десятинъ 995 саженъ, пахатной 62 дес. 1084 саж., лѣсной 1 десятина 1950 саженъ, сѣнокосной 4 десятины 1428 саженъ, а всего 83 десятины 657 саженъ.

Дадатак 4

Выгляд разбуранай царквы Святой Ганны. Фотаздымак 1980 года



Дадатак 5

Абмерныя чарцяжы царквы Святой Ганны

